
Імплемэнтацыя міжнародных стандартаў права ў нацыянальнае заканадаўства й судовую практыку

PRAŬNY FARPOST


#08
08.2013



Праваабарончая інфармацыя:



Навіны, факты, камэнтары праваабаронцаў і экспэртаў права, судовая практыка, стратэгічныя цяжбы, калектыўная абарона правоў і свабодаў грамадзянаў у Беларусі ... (Жодзіна-Смалявічы)





Аляксей Лапіцкі

Licviny-INFA : ДЗЕ Б ТЫ НІ БЫЎ - БУДЗЬ САЛІДАРНЫМ! ...

ПАТРАБУЙ СПРАВЯДЛІВАСЬЦІ І СВАБОДЫ!



АКЦЫІ САЛІДАРНАСЬЦІ ...


Свабоду - палітвязьням!!!

СВАБОДУ АЛЕСЮ БЯЛЯЦКАМУ!

Улады не дазваолілі пікет салідарнасьці 04.08.13. Але жодзінцы выйшлі на акцыі падтрымкі палітвязьняў Беларусі і Алеся Бяляцкага ...




Праўны ФАРПОСТ



Ініцыятыва “Мы - Ліцьвіны” & Licviny-INFA
ВЯСНА, Жодзінскі рэгіён

ЧОРНА-БЕЛЫ ГОНАР (ЖОДЗІНА)



АКЦЫІ САЛІДАРНАСЬЦІ ...

03-04 жніўня ў Жодзіне распачаліся разнастайныя акцыі, прымеркаваныя да дня салідарнасьці з палітвязьнямі й асуджаным да 4,5 год зьняволеньня вядомым праваабаронцам Алесем Бяляцкім.





АКЦЫІ Ў ЖОДЗІНЕ



Актывісты грамадзянскай супольнасьці гораду сабраліся на круглы стол для абмеркаваньня сытуацыі адносна пастаянных забаронаў мірных сходаў і апошнім рашэньнем уладаў №1020 ад 27.07.2012 г., якім практычна да непераадольных пашыраюцца абмежаваньні ў рэалізацыі канстытуцыйных правоў жодзінцаў на публічнае выказваньне меркаваньняў, безперашкодны распаўсюд інфармацыі і мірныя сходы. На падставе гэтай дыскрыімнацыйнай пастановы чарговы раз абсалютна безпадстаўна быў забаронены пікет салідарнасьці з Алесем Бяляцкім у Жодзіне.

Аб масавым мерапрыемстве

[illegible] гарадскі выканаўчы камітэт паведамляе, што [illegible] заява аб правядзе[illegible] масавага мерапрыемства (пікетавання) [illegible] г.Жодзіна 4 жніўня 2013 года [illegible] да 19.30 не можа быць [illegible] ў сувязі с тым, што пададзеныя дакум[illegible] не адпавя[illegible] патрабаванням пункта [illegible] рашэння Жодзінскага гарадского [illegible] камітэта ад 27.06.2012 №1020 "Аб парадку правя[illegible] масавых [illegible]рыемстваў у г.Жодзіна".

Першы намеснік старшыні [illegible] Ю.А.Шары



Жодзіна, 03-04 жніўня 2013 г.

Ва ўмовах забароны заяўленага мерапрыемства ў Жодзіне актывісты вырашылі не праводзіць несанкцыяванага пікетаваньня ды прапанавалі ўсім неабыякавым да сытуацыі самастойна вызначыцца разам з сваімі сябрамі, каб адзначыць гэты дзень у разнастайных незабароненых, адвольных формах грамадзкай актыўнасьці: сустрэчах на сьвежым паветры з аднадумцамі, прагулках пешшу і на роварах, фатаграфаваньнях у цікавых месцах горада, а таксама ў зоне адпачынку, на прыродзе …

У гэты ж дзень шэраг актывістаў падпісалі адмысловыя паштоўкі Алесю Бяляцкаму.

(Працяг на стар. 3)



БЕЛАРУСЬ - У ЭЎРОПУ ...

Фатаграфаваньнем ля часткі вялізнага надпісу ўздоўж чыгункі Жодзіна-Паўднёвага “Чорна-белы гонар…”, завершылі дзень салідарнасьці праваабаронцы.

АКЦЫІ САЛІДАРНАСЬЦІ, ЖОДЗІНА







(Працяг. Пачатак на стар. 3)

Паштоўкі ў хуткім часе разам зь іншымі былі скіраваныя па прызначэньні.

Праваабаронца **Аляксей Лапіцкі** адзначае:

“Нам ніхто не забароніць у любых месцах нашага гораду насіць цішоткі з пажаданьнем свабоды для Алеся Бяляцкага ды іншых вязьняў сумленьня, абменьвацца інфармацыяй, фатаграфаваць і фатаграфавацца, дзяліцца паштоўкамі ці пісаць лісты салідарнасьці зьняволеным паасобку ці разам з сябрамі, знаёмымі.





Разам з тым, гэта дапаможа нам яшчэ больш пашыраць кола сяброўства і ўзаемападтрымкі, аб’ядноўвацца ў салідарных памкненьнях і супольным дзеяньні дзеля хутчэйшага дасягненьня даўгачаканае ўсімі намі... іхнай і нашай СВАБОДЫ.”

Людзі ў абсалютна пераважнай большасьці з разуменьнем і спачуваньнем успрымалі інфармацыю, некаторыя выказвалі аптымізм на хуткае вызваленьне праваабаронцы. Іншыя - скрайне нэгатыўна казалі пра становішча ў краіне, пра неэфэктыўнасьць судовай сыстэмы, розначытаньні ў законах, рэпрэсыўна-карны апарат, створаны рэжымам у Беларусі.

Фатаграфаваньнем ля часткі вялізнага чорна-белага надпісу, зробленага заўзятарамі Жодзінскага “Тарпеда” ўздоўж чыгункі Жодзіна-Паўднёвага “Чорна-белы гонар…”, завершылі дзень салідарнасьці праваабаронцы Жодзіна.

Пасьля 20-00 пасажыры электрацыяў Менск-Ворша і Барысаў-Менск маглі бачыць людзей у чорна-белых цішотках з надпісам “свабоду Алесю Бяляцкаму!” насупраць чорна-белага надпісу па-беларуску (гл. фота на стар. 2)



АКЦЫЯ САЛІДАРНАСЬЦІ З ПАЛІТВЯЗЬНЯМІ ля ГУМа - раздача паштовак з напамінам пра абставіны зьняволеньня Алеся Бяляцкага ...






Акцыі салідарнасьці са зьняволеным праваабаронцам Алесем Бяляцкім і іншымі палітвязьнямі Беларусі працягваліся 04 жніўня ў Жодзіне з 17-00 да 21-30.

Актывісты грамадзянскай супольнасьці ды ПЦ “Вясна” выйшлі ў горад ў чорна-белых цішотках з надпісам “Свабоду Алесю Бяляцкаму!” Яны езьдзілі на роварах і гулялі па вуліцах пешшу, раздавалі жодзінцам інфармацыйныя матэрыялы пра зьняволенага праваабаронцу, размаўлялі зь людзьмі, якія задавалі пытаньні, а таксама фатаграфаваліся …






Ales` Volny



Будзьма РАЗАМ! І – ПЕРАМОЖАМ!



АКЦЫІ САЛІДАРНАСЬЦІ Ў ЖОДЗІНЕ ...




МЫ - УСЕ АЛЕСЬ! МЫ - РАЗАМ!

Алесь - гэта кожны з нас. Гэта - мы! Мы - усе Алесь!
Акцыі салідарнасьці - наш невялікі ўнёсак у барацьбу з рэпрэсыўна-каманднай сыстэмаю, якую навязала народу Беларусі праўладная намэнклятура часоў застою і ейны нязьменны правадыр.
Свабоду Алесю Бяляцкаму!
Свабоду палітзьняволеным у Беларусі!

НАШАЯ САЛІДАРНАСЬЦЬ ...





У салідарнай падтрымцы, ад сэрца да сэрца, з рук у рукі мы здольныя перадаць частачку нашай любові й клопату тым, хто ахвярна змагаецца за нашае права "людзьмі звацца", за нашу свабоду і наш чалавечы гонар, за вольную эўрапейскую будучыню для Беларусі.

Разам - мы народ! Мы - сіла!
І толькі разам, зь любоўю, мы здольныя рабіць сапраўды немагчымае …

Будзьма разам! І … - ПЕРАМОЖАМ!








ЭЎРАДЭПУТАТЫ ЗАКЛІКАЮЦЬ ДА ВЫЗВАЛЕНЬНЯ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ

Дэпутаты Эўрапейскага парлямэнту, Нямеччыны й Швайцарыі выступілі з сумеснай заяваю пра сытуацыю з правамі чалавека ў Беларусі, у якой заклікалі беларускія ўлады неадкладна і безумоўна вызваліць і рэабілітаваць усіх палітзьняволеных. Таксама яны патрабуюць увесьці мараторый на сьмяротнае пакараньне.

Заява прынята напярэдадні Міжнароднага дня салідарнасьці з грамадзянскай супольнасьцю і праваабарончым рухам Беларусі, які адзначаецца 4 жніўня. Ініцыятарам дакумэнту выступілі Марак Мігальскі й швайцарска-нямецкая праваабарончая арганізацыя. Дэпутаты адзначаюць, што больш за 40 беларускіх грамадзянаў былі абмежаваныя ў правах і грамадзянскіх свабодах у выніку палітычна матываваных судовых працэсаў у 2011-2012 гадах.













Радыё Рацыя і licviny.info

FOTA: A. Lapicki

Licviny-INFA

Незалежны праваабарончы інфармацыйны бюлетэнь ..., (Выдавецкая ініцыятыва "ЗА СВАБОДНЫ ВЫБАР", Licviny-INFA)
Жодзінскі рэгіён. Распаўсюд свабодны.
Наклад: 299 асобнікаў. Вясна, 2012г.
ПРАЎНЫ ФАРПОСТ
Пры передруку - усе спасылкі на PF!